# ПЛЕНАРНОЕ ЗАСЕДАНИЕ

## ВОБРАЗ НЯВЕСТЫ Ў БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ

***Сяргеева Аліна, Рэспубліка Беларусь***
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт,*
*Рэспубліка Беларусь, г. Мінск*
*Навуковы кіраўнік – ст.выкладчык Носік А.А.*

*Анатацыя.* Дадзеная праца прысвечана беларускай культуры, якая багата вялікай колькасцю розных вобразаў, абрадаў, рытуалаў і традыцый. Яны сапраўды робяць нашу краіну ўнікальнай і непаўторнай. А вобраз нявесты – адзін з самых галоўных у нашай культуры.

*Ключавыя словы: беларускія традыцыі, абрады, вяселле, нявеста.*

Кожны народ мае свае шматгадовыя традыцыі і звычаі. Колькі краін і народаў – столькі і розных абрадаў, якія адрозніваюцца паміж сабой. У беларускага народа таксама існуе шмат сваіх традыцый.

Вяселле – адно з самых цікавых і складаных свят у нашым жыцці. На сучасных вяселлях мы ўважліва глядзім на маладых, і ў першую чаргу – на нявесту, на яе вопратку: шыкоўную белую сукенку, фату і белыя чаравікі.

Вяселле – вельмі значымы момант у жыцці чалавека. Гэта рытуал, важная падзея і свята. Яно з’яўляецца пачаткам утварэння новай сям’і. Пра характэрную асаблівасць вяселля гаворыць ужо сама назва. Вяселле – ад слова *весела*. І сапраўды, на вяселлі не змаўкаюць песні, музыка, жарты, віншаванні і пажаданні, не спыняюцца танцы, тэатралізаваныя сцэнкі і гульні.

Беларускае вяселле скадвалася на аснове агульнаславянскіх звычаяў і абрадаў, звесткі пра якія пачалі фіксавацца ў XIX стагоддзі, калі на Беларусі актывізавалася грамадскае жыццё і пачалося шырокае вывучэнне побыту і культуры народа [1, с. 16].

Каб вызначыць асноўныя асаблівасці вяселля і зразумець сэнс асобных яго элементаў, неабходна прасачыць увесь ход абраднасці і разгледзець галоўныя моманты: сватанне, змовіны, дзявочнік, зборы і сам дзень вяселля [1, с. 16].

Сваты. Першым этапам урачыстага абраду вяселля на Беларусі з’яўляюцца *сваты*. Нявесту для хлопца выбіралі часцей за ўсё яго бацькі, кіруючыся пры гэтым гаспадарчымі разлікамі і не заўсёды прымаючы пад увагу пажаданні сына. Перш за ўсё, глядзелі, ці багатыя бацькі ў нявесты, бо ад гэтага залежала, які будзе пасаг. Таксама вялікая ўвага звярталася на працавітасць самой дзяўчыны [1, с. 17].

Для паспяховага правядзення абраду сватання нявесты па традыцыі трэба было выконваць пэўныя абрадавыя дзеянні і засцярогі, заснаваныя на веры ў знакі. Напрыклад, серада і пятніца лічыліся неспрыяльнымі днямі для шлюбу. Лік 13 таксама адносілі да неспрыяльных, таму строга сачылі за тым, каб гэты абрад і само вяселле не выпадалі на гэты лік. А вось такія лікі, як 3,

5, 7, 9 для сватання і вяселля былі асаблівымі, таму што прыносілі шчасце і поспех.

Падчас сватаўства ў нашых народаў існавалі таксама абрады выпрабавання будучай жонкі, пры якім дзяўчына павінна была выходзіць у цэнтр пакоя і паказваць свае таленты і ўменні. Жаніх, звяртаючыся да бацькоў сваёй каханай, казаў пра свае пачуцці і прасіў у іх яе рукі.

Пасля сватання, калі было вырашана, што вяселлю быць, нявеста праводзіла такі абрад, як *галашэнне*. Гэта рытуальны плач, які сімвалізаваў развітанне нявесты з бацькамі, сяброўкамі і са сваім мінулым домам. Такім чынам заканчваўся першы этап вясельнага абраду *сваты* [6, с. 26].

Дзявочнік. На другі дзень пасля *сватоў* нявеста разам з сяброўкамі пачынала рыхтаваць пасаг. Розныя рытуалы, звязаныя з пасагам, – развітанне нявесты з сяброўкамі, “дзявочы вечар” – складалі тую частку вясельнага абраду, якая называецца “дзявочнік”.

Перыяд падрыхтоўкі пасагу называлі “тыднем”. Нявеста разам з сяброўкамі ткала палатно, шыла, вышывала. Яна рыхтавала сабе адзенне, ручнікі, абрусы і розныя падарункі родным жаніха, ўпрыгожвала ўбранства ў хаце. Дзяўчаты садзіліся за сталом і вілі вянкі, якія сімвалізавалі дзявочую чысціню, маладосць і прыгажосць [1, с. 19]. Варажылі нявесце “на шчаслівую дарогу” па яе ўплёце. Уплёт нявесты складаўся часцей за ўсё з трох стужак, якія сімвалізавалі тры дарогі: белая стужка – дарогу з роднай хаты, чырвоная – дарогу да дому жаніха, зялёная – маладое жыццё дзяўчыны [6, с. 28].

Асноўнае прызначэнне правядзення дзявочніка заключалася ў тым, што нявеста павінна была падрыхтаваць сабе багаты і добры пасаг.

Зборы. Напярэдадні вяселля рабілі *зборы*. Нявеста сустракала сонца з кветкамі медуніцы ў руках і прасіла ў Сонца шчасця і блаславення, прасіла дараваць ёй памылкі і грахі, каб пайсці з чыстым сэрцам у свае новае жыццё. І толькі пасля гэтага пачыналася сапраўднае вяселле [2, с. 34].

Вяселле. Надыходзіць дзень вяселля. У беларусаў у хатах жаніха і нявесты ўсе падымаюцца з узыходам сонца і пачынаецца самае галоўнае – прыбіранне нявесты да сустрэчы з жаніхом (у гэтым ёй дапамагалі сяброўкі).

Але перад прыездам жаніха нявесту абавязкова павінны былі схаваць. Гэта рабілася для таго, каб жаніх шукаў сваё шчасце, бо лічылася, што сапраўднае шчасце ў рукі адразу не даецца [2, с. 38]. Пасля ўдалых пошукаў сваёй каханай жаніх браў нявесту за рукі, а іх бацькі бласлаўлялі іх хлебам і соллю – вясельным караваем. Гэта быў адзін з самых галоўных атрыбутаў вясельнага абраду і сімвалізаваў багацце, дабрабыт і ўрадлівасць. У беларускай вясельнай абраднасці каравай выступаў яшчэ і “сведчаннем аб заканчэнні юнацтва жаніха і нявесты, аб публічным, агульнарадавым прызнанні іх сталення і згодзе старэйшых уключыць шлюбную пару ў кола правадзейных членаў грамадства” [4, с. 197]. Пры падрыхтоўцы каравая катэгарычна забаранялася запрашаць да ўдзелу ў рытуале ўдовых ці бяздзетных жанчын, каб іх нешчаслівы лёс не паўплываў адмоўна на

будучыню маладой сям'і. Акрамя таго, народная традыцыя прадпісвала гатаваць два каравai: у маладой яго выпякалі ў форме круга-сонца, а ў хаце маладога – падобна да формы месяца [4, с. 198].

Пасля гэтага пачыналася самая вясёлая частка абраду – вясельны баль, на якім маладыя і ўсе госці спявалі песні, танцавалі, праводзілі абрады і проста размаўлялі.

А заканчвалася ўсё вяселле горкім развітаннем нявесты са сваімі роднымі, сябрамі і домам, бо зараз яна разам са сваім жаніхом павінна была ехаць у свой новы дом, дзе і пачнецца яе новае замужняе жыццё.

Заключэнне. Вяселле – не толькі адзін з самых старажытных беларускіх абрадаў, але і самае ўрачыстае, самае прыгожае сямейнае свята, своеасаблівае тэатралізаванае прадстаўленне, у якім ярка адлюстраваліся характар і светапогляд народа, яго мастацкія здольнасці і псіхалогія.

Безумоўна, зараз мы жывём у час інфармацыйных тэхналогій, калі людзі не надаюць вялікага значэння духоўным і культурным каштоўнасцям. Так, сённяшняе вяселле значна адышло ад многіх традыцый мінулага, але ўсё роўна не страціла арэола святасці і веры ў божае прадвызначэнне.

Думаецца, што дадзеная праца прыцягне ўвагу моладзі да неабходнасці зберажэння народных традыцый, на іх глыбокі сэнс і змест і паспрыяе тым самым захаванню беларускай народнасці, сваіх каранёў і вытокаў.

Літаратура:

1. Вяселле: абрад / Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. - Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 635 с.
2. Казакова, І. В. Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў / І. В. Казакова. – Мн.: Універсітэцкае, 1995. – 151 с.
3. Котович, О. В. Белорусская свадьба: тайные ключи семейного счастья" / О. Котович, Я. Крук. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2011. – 72 с.
4. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. 2-е выд., стэр. / Я. Крук. – Мн. Ураджай, 2001. – 350 с.
5. Никольский, Н. М. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности / Н. М. Никольский. – Мн.: АН БССР, 1956. – 269 с.
6. Вясельная традыцыя Гомельшчаны: фальклорна-этнаграфічны зборнік/ Укладанне В. С. Новак; Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Мінск: Права і эканоміка, 2011. – 485 с.